КАНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А. В. Макоўчык
«20» 04 2021 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-3-м1-2021/вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-01 02 01 Пачатковая адукацыя

2021 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове Адукацыйнага стандарта Рэспублікі Беларусь «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень» ОСВО 1-01 02 01-2013 і вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя, на аснове тыпавой вучэбнай праграмы «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» (рэгістрацыйны № ТД- А.579/тып.), зацверджанай 20.05.2015.

**СКЛАДАЛЬНІК**:

Свірыдзенка В. І., дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

В. І. Цірынава, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

А. В. Вернікоўская, дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА**

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Мінска»

_______________ Т. М. Стрэльнікава

«25» ___сакавіка___ 2021 г.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

практакол № 9 ад «26» сакавіка 2021 г.

Загадчык кафедры

_____________________ А. С. Васілеўская

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

пратакол № __ ад «__» ___________ 2021 г.

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзейным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела

________________ С.А.Старадуб

Дырэктар бібліятэкі

______________ Н. П. Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гуманітарнае развіццё асобы - адна з асноўных задач сучаснай школы. У вырашэнні гэтай задачы важнае месца адводзіцца моўнай адукацыі чалавека. Навучанне беларускай мове ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца камунікатыўнай накіраванасцю, якая забяспечвае развіццё ў вучняў гатоўнасці да эфектыўных маўленчых зносін у розных сферах дзейнасці. Такі падыход прадугледжвае засваенне не толькі сістэмы мовы, але і правілаў функцыянавання яе адзінак у маўленні, што азначае фарміраванне ў навучэнцаў як лінгвістычнай, так і камунікатыўнай кампетэнцыі.

Беларуская мова ў 1-4 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання з’яўляецца адным з асноўных вучэбных прадметаў. На ўроках роднай мовы школьнікі вучацца правільна пісаць, засвойваюць асноўныя моўныя паняцці, выпрацоўваюць уменні і навыкі ў вусным і пісьмовым маўленні, рыхтуюцца да засваення сістэматычнага курса беларускай мовы ў далейшым школьным навучанні.Літаратурнае чытанне выступае ў якасці арганічнага звяна сістэмы адзінай бесперапыннай літаратурнай адукацыі і ўяўляе сабой самастойны вучэбны прадмет, які ўводзіць дзяцей у свет мастацкай літаратуры, абуджае ў іх цікавасць да кніг і чытання, закладвае асновы чытацкай культуры.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання навучэнцы авалодваюць практычнымі ўменнямі засваення беларускай мовы як сродку зносін. Яны вучацца правільна гаварыць, чытаць і пісаць па-беларуску, засвойваюць беларускую лексіку, атрымліваюць прапедэўтычныя звесткі па фанетыцы, словаўтварэнні, граматыцы і правапісе.

Беларуская мова служыць важным сродкам выхавання школьнікаў. Яна дапамагае педагогу далучаць вучняў да мастацкай літаратуры, развіваць у іх пазнавальныя магчымасці, фарміраваць асновы навуковага светапогляду.

### Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны - дапамагчы студэнтам засвоіць тэорыю навучання школьнікаў мове, авалодаць уменнямі правільна арганізоўваць вучэбна-выхаваўчы працэс і кіраваць пазнавальнай дзейнасцю вучняў.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны:

дапамагчы студэнтам засвоіць тэарэтычныя веды, вынікам чаго будзе правільнае разуменне будучымі настаўнікамі накіраванасці, логікі і структуры курса беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах;

дапамагчы студэнтам асэнсаваць мэты навучання мове і літаратурнаму чытанню; пазнаёміць з праграмамі, падручнікамі (усвядоміць іх ідэі, змест, будову); навучыць планаваць і арганізоўваць вучэбны працэс;

сфарміраваць у студэнтаў уменне аналізаваць тэксты розных тыпаў і жанраў, падбіраць дыдактычны матэрыял да ўрокаў, праводзіць розныя віды пісьмовых прац, весці апытванне і аб’ектыўна ацэньваць веды, уменні і

навыкі вучняў, правільна выкарыстоўваць нагляднасць і ТСН у навучальным працэсе;

стымуляваць творчыя пошукі студэнтаў, фарміраваць уменні працаваць з навукова-метадычнай літаратурай, развіваць навукова-даследчыя здольнасці, выхоўваць маральна-этычныя якасці, неабходныя сучаснаму настаўніку.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста адпаведнага профілю, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі**

Тэматыка і змест дысцыпліны разглядаюцца ў кантэксце вядучых тэндэнцый сучаснай лінгваметодыкі. Пры вывучэнні дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з іншымі дысцыплінамі («Педагогіка», «Беларуская мова», «Методика преподавания русского языка и литературного чтения»).

**Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам**

Адпаведна адукацыйнаму стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-01 02 01-2013 па спецыяльнасці 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «**Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання**» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-7. Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнаваўчай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

ПК-11. Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і іншымі крыніцамі інфармацыі.

ПК-13. Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

ПК-14. Папярэджваць і пераадольваць непаспяховасць навучэнцаў.

ПК-15. Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

ПК-16. Ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканальвання прафесійнай дзейнасці.

ПК-18. Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

ПК-19. Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з’явы і падзеі мінулага ў свеце сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты ***павінны ведаць:***

асноўныя паняцці методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах;

змест і патрабаванні праграмы па беларускай мове і літаратурным чытанні ў пачатковых класах;

методыку навучання грамаце ў пачатковых класах;

метады і прыёмы вывучэння кожнага з раздзелаў курса беларускай мовы ў пачатковых класах;

этапы фарміравання паўнацэннага навыку чытання;

методыку вывучэння літаратурных твораў у пачатковых класах.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты ***павінны ўмець:***

рэалізоўваць у прафесійнай дзейнасці тэарэтычныя веды па методыцы выкладання беларускай мове і літаратурнага чытання ў пачатковыхкласах;

падбіраць і выкарыстоўваць дыдактычны матэрыял у розных відах вучэбнай дзейнасці;

спалучаць работу па засваенні вучнямі нормаў і законаў беларускай мовы з фарміраваннем камунікатыўных уменняў і навыкаў;

выяўляць, класіфікаваць і папярэджваць моўныя і маўленчыя памылкі рознага характару ў вусных выказваннях і пісьмовых працах вучняў пачатковых класаў;

распрацоўваць методыку вывучэння мастацкага тэксту з улікам спецыфікі яго роду і жанру, узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты ***павінны валодаць:***

навыкамі падрыхтоўкі і правядзення розных тыпаў урокаў па беларускай мове і літаратурным чытанні;

метадамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;

навыкамі ацэначнай дзейнасці вусных і пісьмовых работ навучэнцаў;

навыкамі аналізу літаратурнага твора;

навыкамі арганізацыі пазакласнага чытання.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам**

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» разлічана на 280 гадзін. З іх 140 аўдыторныя:

**для дзённай формы атрымання адукацыі**:

у 4 семестры ўсяго 90 гадзін, аўдыторных – 54 гадзіны;
аўдыторныя:
28 г. лекцый, з іх 2 г. КСР,
22 г. практычных заняткаў, з іх 6 г. КСР,
4 г. лабараторных заняткаў;
самастойная работа – 36 гадзін;
форма кантролю – залік;

у 5 семестры ўсяго 190 гадзін, аўдыторных – 86 гадзін;
аўдыторныя:
38 г. лекцый, з іх 4 г. КСР,
44 г. практычных заняткаў, з іх 6 г. КСР,
4 г. лабараторных заняткаў,
самастойнай работа-68 гадзін;
форма кантролю – экзамен;

**для завочнай формы атрымання адукацыі:**у 6 семестры 8 г. лекцый 4 г. практычных заняткаў, 2 г. лабараторных заняткаў, форма кантролю – залік у 7 семестры; у 7 семестры 8 г. лекцый, 8 г. практычных заняткаў, 4 г. лабараторных заняткаў, форма кантролю – экзамен у 8 семестры.

**для завочнай скарочанай формы атрымання адукацыі:** у 2 семестры 4 г. лекцый 2 г. практычных заняткаў, форма кантролю – залік у 3 семестры; у 3 семестры 6 г. лекцый, 4 г. практычных заняткаў, 2 г. лабараторных заняткаў, форма кантролю – экзамен у 4 семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### Тэма 1.1. МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК НАВУКА

Методыка пачатковага навучання беларускай мове як навука. Тэорыя пазнання – метадалагічная аснова методыкі выкладання беларускай мовы. Прадмет і задачы курса методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах. Структура курса методыкі. Прынцыпы навучання роднай мове ў пачатковай школе. Метады навуковага даследавання.

Месца методыкі пачатковага навучання сярод іншых навук. Сувязь яе з філасофіяй, мовазнаўствам, літаратуразнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай.

Кароткі гісторыка-крытычны агляд методыкі пачатковага навучання мове і чытанню. Роля К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа) у станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы. Новыя тэхналогіі ў сістэме навучання малодшых школьнікаў мове, актуальныя праблемы методыкі выкладання беларускай мовы на розных этапах.

### Тэма 1.2. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ВУЧЭБНЫ ПРАДМЕТ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Значэнне беларускай мовы у сістэме школьнай адукацыі, у фарміраванні інтэлектуальна развітай асобы. Задачы навучання мове ў пачатковых класах.

Змест адукацыі па мове ў сучаснай школе. Месца роднай (беларускай) мовы ў вучэбных планах і праграмах агульнаадукацыйнай школы (пачатковыя класы). Пераемнасць і перспектыўнасць у навучанні.

Прынцыпы пабудовы праграмы па беларускай мове ў пачатковых класах. Раздзелы праграмы, змест, сістэма размяшчэння вучэбнага матэрыялу; патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў па гадах навучання. Прадметныя вынікі асваення зместу праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова», акрэсленыя ў адукацыйным стандарцепачатковай адукацыі. Развіццёвыя магчымасці прадмета «Беларуская мова», яго выхаваўчае значэнне. Агульнае і спецыфічнае ў раздзелах праграм ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі для пачатковых класаў, іх змест, прынцыпы пабудовы.

# РАЗДЗЕЛ 2. МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

## Тэма 2.1. НАВУКОВЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Роля пісьменнасці ў развіцці мовы і грамадства. Значэнне і задачы навучання грамаце ў агульнай сістэме вучэбна-развіццёвага навучання і выхавання малодшых школьнікаў.

Навуковыя асновы методыкі навучання грамаце ў сучаснай школе. Звесткі з фанетыкі, графікі, словаўтварэння, граматыкі, што павінны ўлічвацца пры навучанні грамаце. Фанетычная і графічная структура слова, іх узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць. Чытанне і пісьмо – віды маўленчай дзейнасці. Механізм чытання і пісьма. Значэнне антыцыпацыі і поля зроку ў чытанні, методыка іх развіцця. Псіхафізіялагічная характарыстыка працэсаў чытання і пісьма. Этапы фарміравання ўменняў і навыкаў чытання і пісьма. Педагагічныя патрабаванні да навучання грамаце з улікам узроставых асаблівасцей дзяцей, іх магчымасцей у засваенні матэрыялу.

Класіфікацыя метадаў навучання грамаце. Кароткі гісторыка-крытычны агляд метадаў навучання грамаце: літаразлучальны, складовы, гукавы, метад цэлых слоў. Гукавы аналітыка-сінтэтычны метад у распрацоўцы К. Д. Ушынскага і яго паслядоўнікаў. К. М. Міцкевіч пра навучанне грамаце. Праблемы развіцця методыкі навучання грамаце на сучасным этапе. Роля буквара ў навучанні грамаце. З гісторыі буквароў на Беларусі. Прынцыпы пабудовы сучаснага буквара, яго развіццёвыя і выхаваўчыя магчымасці. Навейшыя даследаванні ў галіне методыкі навучання чытанню і пісьму.

## Тэма 2.2. СУЧАСНЫ ГУКАВЫ АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНЫ МЕТАД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучання грамаце, яго адукацыйнае і выхаваўчае значэнне. Гук — аснова навучання грамаце, склад — адзінка чытання. Гукавая структура слова як важнейшы арыенцір чытання і пісьма. Графічны вобраз слова — аснова правапісных уменняў і навыкаў. Развіццёвы характар сістэмы аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці вучняў, апора на жывое маўленне. Фарміраванне і развіццё ў дзяцей фанематычнага слыху. Прыметы сучаснага метаду навучання грамаце.

Развіццё маўлення і мыслення пры навучанні грамаце. Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка навучэнцаў. Выхаванне чуйнасці да сэнсавых адценняў слоў, да граматычных форм і ўжывання іх у звязным маўленні. Словаўтваральная, граматычная і арфаграфічная прапедэўтыка пры навучанні грамаце. Авалоданне нормамі літаратурнага вымаўлення.

Працэс навучання грамаце з улікам перыядаў: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны), заключны (паслябукварны).

Сучасны вучэбна-метадычны комплекс па навучанні грамаце.

## Тэма 2.3. АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ ПРАЦЫ Ў ПАДРЫХТОЎЧЫ ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце, яго змест і задачы.

Веды, уменні і навыкі, якімі авалодваюць вучні ў падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце. Змест заняткаў у падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце: практычнае азнаямленне дзяцей з маўленнем, тэкстам, сказам, словам, складам, націскам, гукам, галоснымі і зычнымі гукамі. Развіццё ў вучняў увагі да гукаў роднай мовы.

Патрабаванні да ўрока навучання грамаце ў падрыхтоўчы перыяд, яго структура. Развіццё маўлення і мыслення дзяцей. Выкарыстанне наглядных дапаможнікаў, дыдактычных гульняў і займальнага матэрыялу.

Улік засваення ведаў, уменняў і навыкаў у падрыхтоўчы перыяд адпаведна асноўным патрабаванням вучэбнай праграмы на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак.

## Тэма 2.4. АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗМЕСТ ПРАЦЫ Ў АСНОЎНЫ ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Сістэма заняткаў на асноўным этапе навучання грамаце. Змест, задачы, важнейшыя асаблівасці навучання чытанню і пісьму ў залежнасці ад будовы буквара (парадку вывучэння гукаў і літар, характару складоў і слоў). Артыкуляцыйныя прыёмы выдзялення зычных і галосных. Удасканаленне правільнага вымаўлення ўсіх гукаў у моўнай плыні. Аналітыка-сінтэтычныя практыкаванні, іх значэнне ў выпрацоўцы навыкаў чытання і пісьма. Навучанне чытанню прамых складоў. Метады і прыёмы выпрацоўкі тэхнікі чытання цэлымі словамі. Фарміраванне ўмення адрозніваць тэкст ад набору сказаў. Тыпы ўрокаў навучання грамаце, іх структура ў асноўны перыяд навучання грамаце. Патрабаванні да ўрокаў навучання грамаце ў асноўны перыяд.

Заключны перыяд навучання грамаце, яго задачы, тэматыка чытання, структура ўрокаў. Развіццё навыкаў чытання і пісьма, выпрацаваных у асноўны (букварны) перыяд, і пераход да чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і інш.). Розныя формы ўзнаўлення тэксту: адказы на пытанні, расказванне, вусны пераказ, слоўнае і графічнае маляванне. Дапаўненне сюжэта, складанне па малюнку невялікага тэксту (апавядання, казкі).

Шляхі і сродкі выпрацоўкі самастойнасці школьнікаў у перыяд навучання грамаце. Выкарыстанне наглядных дапаможнікаў, дыдактычных гульняў і займальнага матэрыялу.

Улік засваення ведаў, уменняў і навыкаў у асноўны і заключны перыяды адпаведна асноўным патрабаванням вучэбнай праграмы на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак.

### Тэма 2.5. НАВУЧАННЕ ПІСЬМУ Ў АСНОЎНЫ ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Задачы выпрацоўкі навыку пісьма на розных этапах навучання грамаце. Псіхафізіялагічныя асновы і гігіенічныя ўмовы выпрацоўкі графічнага навыку. Этапы фарміравання ў дзяцей навыку пісьма, найбольш эфектыўныя прыёмы навучання пісьму. Характарыстыка сучасных пропісяў. Цяжкасці, што ўзнікаюць у вучняў пры авалоданні навыкамі напісання літар, слоў, сказаў; іх характарыстыка, прыёмы пераадолення.

Патрабаванні да ўрокаў пісьма ў першым класе. Элементы арфаграфічнай прапедэўтыкі ў перыяд навучання грамаце.

Улік засваення ведаў, уменняў і навыкаў на розных этапах навучання грамаце адпаведна асноўным патрабаванням вучэбнай праграмы на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак.

### Тэма 2.6. РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І МЫСЛЕННЯ ВУЧНЯЎ У ПЕРЫЯД НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

Фарміраванне ў вучняў пазнавальнай актыўнасці, развіццё памяціі мыслення. Прынцыпы развіцця маўлення пры навучанні грамаце.

Выпраўленне дэфектаў дыкцыі. Выпрацоўка гукавой культуры маўлення. Узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў. Слоўнікава-лагічныя практыкаванні (параўнанне, абагульненне, групоўка, класіфікацыя). Прапедэўтычная праца з сінонімамі, антонімамі, амонімамі, мнагазначнымі словамі. Праца са словазлучэннем і сказам. Развіццё звязнага маўлення першакласнікаў. Пераказ прачытанага па пытаннях, падбор загалоўкаў да тэксту, складанне вусных апавяданняў па малюнках, па назіраннях.

Развіцце маўлення вучняў на ўроках навучання пісьму.

## РАЗДЗЕЛ 3. МЕТОДЫКА КЛАСНАГА І ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

### Тэма 3.1. СІСТЭМА КЛАСНАГА ЧЫТАННЯ Ў СУЧАСНАЙ ШКОЛЕ

Адукацыйнае, развіццёвае і выхаваўчае значэнне літаратурнага чытання. Фарміраванне базавых кампанентаў культуры малодшых школьнікаў у працэсе іх літаратурнай адукацыі. Задачы ўрокаў чытання ў пачатковых класах на сучасным этапе.

Сувязь методыкі літаратурнага чытання з іншымі навукамі. Літаратуразнаўчыя і псіхолага-педагагічныя палажэнні, якія вызначаюць методыку чытання і аналізу мастацкіх твораў па гадах навучання. Гісторыка-крытычны агляд метадаў чытання.

Прынцыпы пабудовы праграмы па літаратурным чытанні ў пачатковых класах, яе раздзелы, змест і тэматыка па гадах навучання. Падручнікі па чытанні, іх структура.

Заканамернасці і прынцыпы арганізацыі ўрокаў чытання мастацкіх твораў.

Улік засваення ведаў, уменняў і навыкаў на ўроках літаратурнага чытання ў другім класе адпаведна асноўным патрабаванням вучэбнай праграмы на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак. Праверка і ўлік ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых вучнямі на ўроках літаратурнага чытання. Віды і формы апытання, методыка яго ажыццяўлення. Нормы ацэнкі вусных адказаў вучняў.

### Тэма 3.2. ЯКАСЦІ ПАЎНАЦЭННАГА НАВЫКУ ЧЫТАННЯ І ШЛЯХІ ЯГО ВЫПРАЦОЎКІ

Этапы фарміравання навыку чытання. Якасці паўнацэннага навыку чытання: правільнасць, свядомасць, бегласць, выразнасць. Чытанне ўголас і маўклівае чытанне (сам сабе). Практыкаванні на антыцыпацыю, развіццё поля зроку (“поля чытання”).

Правільнае чытанне. Тыповыя памылкі пры чытанні на розных этапах навучання, прыёмы іх папярэджання і выпраўлення. Патрабаванні да правільнасці чытання. Прыёмы выпрацоўкі правільнага чытання.

Свядомае чытанне. Патрабаванні да свядомасці чытання. Выпрацоўка навыку свядомага чытання. Слоўнікавая (лексічная) работа як адзін з прыёмаў выпрацоўкі асэнсаванага чытання. Эмацыянальнае ўспрыманне зместу твора, азнаямленне з яго структурай, разгляд ілюстрацый.

Беглае чытанне. Патрабаванні да бегласці чытання. Прыёмы выпрацоўкі такога чытання. Віды чытання: выбарачнае, чытанне ланцужком, чытанне дыялогаў (па ролях), завучванне на памяць вершаў, скорагаворак, баек і і інш.

Выразнае чытанне. Патрабаванні да выразнасці чытання. Асноўныя сродкі, што забяспечваюць выразнасць чытання: дыханне, дыкцыя, лагічны націск, лагічныя і псіхалагічныя паўзы, тон і тэмп чытання, інтанацыя. Прыёмы навучання выразнаму чытанню.

Праверка і ўлік уменняў і навыкаў у чытанні: правільнасць, асэнсаванасць, бегласць, выразнасць; уменне вызначаць галоўную думку тэксту, расказваць пра героя ці падзею, пераказваць тэкст, даваць ацэнку прачытанаму; вызначаць жанр мастацкага твора, яго структуру.

### Тэма 3.3. ЭТАПЫ ПРАЦЫ З МАСТАЦКІМ ТВОРАМ

Этапы працы з мастацкім творам. Разнастайнасць заняткаў на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковых класах з улікам псіхалагічных асаблівасцей і ўзроставых магчымасцей школьнікаў. Задачы і характар заданняў пры чытанні і аналізе мастацкага твора. Першаснае чытанне і праверка эмацыянальнага ўспрымання прачытанага. Аналіз зместу твора ў адзінстве з яго формай. Гутарка як метад працы на ўроках літаратурнага чытання, яе віды, формы правядзення. Віды вусных пераказаў, методыка іх правядзення. Падрыхтоўчая праца да пераказу, яе змест, характар заданняў і пытанняў. Навучанне складанню плана прачытанага тэксту. Літаратурная творчасць вучняў пры чытанні і аналізе мастацкіх твораў: драматызацыя і

інсцэніраванне, апавяданні па аналогіі з прачытаным, дамысліванне лёсу герояў, развіццё пэўных падзей, што разглядаліся ў творы, складанне дыялогаў, невялікіх казак, загадак.

Асноўныя тыпы ўрокаў літаратурнага чытання, іх структурныя кампаненты. Падрыхтоўка педагога да чытання і аналізу твораў розных жанраў. Падагульняльныя ўрокі, іх структура, змест і значэнне ў агульнай сістэме ўрокаў па тэме ці раздзеле. Падрыхтоўка педагога і навучэнцаў да падагульняльных урокаў. Узаемасувязь розных відаў заняткаў на падагульняльных уроках.

Асаблівасці працы з мастацкім творам на ўроках літаратурнага чытання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

## Тэма 3.4. АСАБЛІВАСЦІ ЧЫТАННЯ І АНАЛІЗУ ТВОРАЎ РОЗНЫХ ЖАНРАЎ

Чытанне і аналіз твораў розных жанраў: апавяданняў, вершаў, казак, баек, прыказак. Азнаямленне навучэнцаў пачатковых класаў з вобразна-выяўленчымі сродкамі ў мастацкіх творах, методыка працы з імі. Віды тэксту, вызначэнне іх характэрных асаблівасцей.

Методыка чытання і аналізу апавяданняў. Віды заданняў у залежнасці ад характару апавядання і развіцця сюжэта. Арганізацыя назіранняў за мовай твора, асаблівасцямі яе выкарыстання пісьменнікам з мэтай стварэння мастацкага вобраза, раскрыцця характараў герояў, матываў іх паводзін. Высвятленне кампазіцыі твора, яго ідэі. Асаблівасці чытання і аналізу твораў з гістарычным зместам.

Чытанне і аналіз розных лірычных вершаў: пейзажнай, пейзажна-псіхалагічнай лірыкі, псіхалагічнай лірыкі, лірыкі роздуму. Чытанне эпічных вершаў, іх аналіз. Вызначэнне сродкаў выразнасці і мастацкае чытанне вершаў. Прыёмы завучвання вершаў на памяць.

Чытанне баек, вызначэнне іх мастацкіх асаблівасцей. Аналіз зместу баек, раскрыццё алегорыі, засваенне вучнямі маралі.

Казка як жанр мастацкага твора. Усведамленне дзецьмі кампазіцыі казкі. Прыёмы і формы працы з вобразнымі сродкамі, выяўленне лексічных і сінтаксічных асаблівасцей казкі. Педагагічнае ўздзеянне казак на розум і пачуцці навучэнцаў. Расказванне казак.

Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя сродкі навучання. Узаемадзеянне наглядных і лексічных сродкаў пры чытанні і аналізе мастацкіх твораў. Сувязь урокаў літаратурнага чытання з экскурсіямі, назіраннямі за прыродай у розныя поры года. Выкарыстанне на ўроках краязнаўчага матэрыялу, жывапісу, музыкі.

Актывізацыя вучэбнай і пошукавай дзейнасці навучэнцаў на ўроках літаратурнага чытання. Развіццё звязнага вуснага маўлення. Самастойная праца вучняў, яе характар, віды заданняў, месца падчас аналізу твора.

### Тэма 3.5. ПРАЦА З ПРЫКАЗКАМІ, ПРЫМАЎКАМІ І ЗАГАДКАМІ НА ЎРОКАХ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Чытанне і аналіз прыказак і загадак. Разуменне вучнямі тэмы і зместу прыказак. Выкарыстанне прыказак у адукацыйным працэсе. Загадка — малы літаратурны жанр. Выяўленне прымет, пакладзеных у аснову загадкі. Выпрацоўка ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту ўменняў адгадваць загадкі, складаць іх.

Асаблівасці працы з прыказкамі, прымаўкамі і загадкамі на ўроках беларускай мовы.

### Тэма 3.6. ЗАДАЧЫ І АРГАНІЗАЦЫЯ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Пазакласнае чытанне, яго мэты і задачы. Змест пазакласнага чытання. Месца пазакласнага чытання ў сістэме пачатковага навучання. Кніга як сродак павышэння пазнавальнай актыўнасці малодшых школьнікаў. Прынцыпы адбору кніг для чытання.

Фарміраванне чытацкай самастойнасці вучняў на розных этапах, развіццё ў дзяцей цікавасці да кнігі, выпрацоўка неабходных уменняў і навыкаў культуры чытання, пазнанне праз кнігу духоўных каштоўнасцей грамадства.

Вучэбны матэрыял да ўрокаў пазакласнага чытання з улікам этапаў навучання, яго асаблівасці, асноўныя патрабаванні.

Формы арганізацыі і кіраўніцтва пазакласным чытаннем у пачатковых класах: урокі пазакласнага чытання, індывідуальная праца з вучнямі, пазакласныя мерапрыемствы, ранішнікі, конкурсы. Прапаганда кнігі, прыёмы актывізацыі самастойнага чытання. Кантроль і формы ўліку.

### Тэма 3.7. УРОКІ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

Урокі пазакласнага чытання, агульныя патрабаванні да іх. Сістэма ўрокаў пазакласнага чытання, умовы іх арганізацыі і методыка правядзення. Віды заняткаў на ўроках пазакласнага чытання, іх узаемасувязь, прыёмы рэалізацыі. Кіраўніцтва самастойным чытаннем на падрыхтоўчым этапе. Урокі пазакласнага чытання на пачатковым і асноўным этапах.

## РАЗДЗЕЛ 4. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ АСОБНЫХ ТЭМШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

### Тэма 4.1. ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ І ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Звесткі з гісторыі методыкі выкладання фанетыкі, граматыкі і правапісу. К. М. Міцкевіч пра граматычныя азначэнні і правілы, іх засваенне вучнямі пачатковых класаў. Навуковыя асновы методыкі выкладання

фанетыкі, граматыкі і правапісу. Заканамернасці і прынцыпы засваення беларускай мовы.

Агульная характарыстыка задач і зместу пачатковага навучання беларускай мове. Структура праграмы, аб’ём матэрыялу, сістэма размеркавання па гадах навучання, яе характарыстыка, узаемасувязь паміж раздзеламі праграмы, яе абгрунтаванне.

Фарміраванне ў малодшых школьнікаў асноў навуковага светапогляду пры навучанні роднай мове. Развіццё пазнавальнай актыўнасці. Выкарыстанне прыёмаў аналізу, сінтэзу, параўнання і супастаўлення. Выпрацоўка ўменняў рабіць вывады і абагульненні. Фарміраванне абстрактнага мыслення на аснове назіранняў за моўнымі з’явамі.

### Тэма 4.2. МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Развіццёвае навучанне пры засваенні законаў і правілаў фанетыкі, словаўтварэння, граматыкі і правапісу з апорай на агульнадыдактычныя і лінгваметадычныя прынцыпы. Асноўныя метады і прыёмы навучання беларускай мове: паведамленне, слова настаўніка; назіранні за моўнымі з’явамі, іх аналіз, абагульненне і вывад; работа з падручнікам, табліцамі і іншым вучэбным матэрыялам; самастойная праца навучэнцаў; розныя віды граматычнага разбору; практыкаванні творчага характару. Праграмаванае навучанне і электронныя сродкі навучання (ЭСН).

### Тэма 4.3. УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў. Патрабаванні да ўрокаў вывучэння граматыкі і правапісу. Методыка правядзення ўрокаў беларускай мовы.

Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя сродкі навучання і дыдактычны матэрыял, іх месца на ўроках мовы, прыёмы выкарыстання.

Паўтарэнне пройдзенага па граматыцы і правапісе. Сістэматычнасць паўтарэння з мэтай замацавання вывучанага і паглыблення ведаў вучняў. Абагульненне вывучанага матэрыялу. Спецыяльныя ўрокі паўтарэння ў пачатку, у канцы чвэрці, у канцы навучальнага года. Падагульняльныя ўрокі, іх структура, змест, асаблівасці арганізацыі, методыка правядзення.

Праверка і ўлік ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых вучнямі па беларускай мове. Віды і формы апытання, методыка яго ажыццяўлення. Нормы ацэнкі вусных адказаў вучняў, розных відаў пісьмовых прац.

### Тэма 4.4. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ АСНОЎ ФАНЕТЫКІ І ГРАФІКІ. ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ФАНЕТЫКІ

Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі. Методыка працы над гукамі, літарамі, складам, націскам. Развіццё ў вучняў уменняў распазнаваць галосныя і зычныя гукі, націскныя і ненаціскныя

склады, парныя па цвёрдасці і мяккасці, звонкасці і глухасці зычныя гукі. Вызначэнне гукавога і літарнага складу слова. Фарміраванне ў малошых школьнікаў гукавога і графічнага вобразаў слоў, іх суаднясенне, высвятленне агульнага і адметнага. Знаёмства з алфавітам, фарміраванне ўменння карыстацца ім на практыцы.

Развіццё мыслення і маўлення дзяцей пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі. Развіццё ў вучняў фанематычных уменняў. Выпрацоўка ў малодшых школьнікаў навыкаў літаратурнага вымаўлення. Арфаэпічныя памылкі, прычыны іх узнікнення, прыёмы і спосабы папярэджання і выпраўлення.

## Тэма 4.5. МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАТЫЧНЫХ І СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ. ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЭЛЕМЕНТАЎ ГРАМАТЫКІ І СЛОВАЎТВАРЭННЯ

Сутнасць граматычных паняццяў, метадычныя прыёмы і формы іх засваення. Цяжкасці засваення школьнікамі граматычных паняццяў. Метадычныя ўмовы эфектыўнага іх засваення.

Словаўтваральныя і граматычныя практыкаванні, іх тыпы і прызначэнне; методыка правядзення на розных этапах засваення паняццяў. Патрабаванні да практыкаванняў: аб’ём, якасць моўнага матэрыялу, яго даступнасць для дзяцей пэўнага ўзросту. Граматычны разбор, яго віды, методыка правядзення.

## Тэма 4.6. ВЫВУЧЭННЕ МАРФЕМНАГА СКЛАДУ СЛОВА. ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ МАРФЕМНАГА СКЛАДУ СЛОВА

Значэнне і задачы працы па вывучэнні марфемнага складу слова ў пачатковых класах. Значэнне словаўтваральнай працы ва ўзбагачэнні слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў. Сістэма вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах: знаёмства вучняў з асаблівасцямі аднакаранёвых слоў і кораня слова, з роляй прыставак, суфіксаў, канчатка; паглыбленне ведаў пра марфемны склад слова і элементы словаўтварэння ў сувязі з вывучэннемчасцін мовы. Марфемны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення марфемнай структуры слова.

Выпрацоўка арфаграфічнага навыку на аснове засваення марфемнай будовы слова. Віды практыкаванняў для вывучэння марфемнай будовы слова і выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў.

## Тэма 4.7. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ЭЛЕМЕНТАЎ МАРФАЛОГІІ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ. ФАРМІРАВАННЕ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЧАСЦІН МОВЫ

Задачы і змест працы па вывучэнні часцін мовы ў пачатковых класах.

Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах, яе абгрунтаванне. Методыка азнаямлення вучняў з родам, лікам, склонам назоўнікаў. Паняцце

пра скланенне назоўнікаў. Засваенне склонавых пытанняў. Ужыванне прыназоўнікаў з назоўнікамі розных склонаў. Практычнае авалоданне формамі назоўнікаў першага, другога, трэцяга скланенняў. Развіццё маўлення і мыслення школьнікаў пры вывучэнні назоўнікаў.

Сістэма вывучэння прыметніка ў 1 – 4 класах: фарміраванне паняцця «прыметнік», праца над катэгорыямі роду, ліку і склону прыметніка. Лексіка-стылістычная работа ў працэсе вывучэння прыметніка.

Сістэма вывучэння дзеяслова ў 1 – 4 класах: фарміраванне паняцця «дзеяслоў», азнаямленне вучняў з формамі часу дзеяслова, тлумачэнне змянення дзеясловаў па асобах і ліках, паняцце аб неазначальнай форме дзеяслова, аб першым і другім спражэнні дзеясловаў. Развіццё маўлення вучняў у працэсе вывучэння дзеяслова.

Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах.

Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах. Работа над усведамленнем вучнямі ролі прыназоўнікаў, іх семантыкі. Навучанне выкарыстанню ў маўленні граматычных канструкцый з прыназоўнікамі і злучнікамі.

Выпрацоўка арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы.

### Тэма 4.8. ВЫВУЧЭННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ СІНТАКСІСУ І ПУНКТУАЦЫІ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Значэнне, задачы, змест і сістэма працы па вывучэнні элементаў сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах. Фарміраванне ў вучняў асноўных сінтаксічных паняццяў. Сінтаксічны матэрыял у 1 – 4 класах: сказ, віды сказаў па інтанацыі і мэце выказвання, члены сказа, сувязь слоў у сказе, словазлучэнне, аднародныя члены сказа. Сінтаксічныя веды, уменні і навыкі, якія павінны набыць вучні пры засваенні часцін мовы. Выкарыстанне знакаў прыпынку ў канцы сказаў, пры аднародных членах сказа.

### Тэма 4.9. ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ

Перанос, транспазіцыя і інтэрферэнцыя. Дыферэнцыяльна-сістэматычны прынцып навучання. Камунікатыўная накіраванасць навучання. Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы для пачатковых класаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

Асаблівасці працы над фанетыкай, графікай, лексікай, граматыкай, арфаграфіяй беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

### Тэма 4.10. ВЫПРАЦОЎКА АРФАГРАФІЧНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ

Методыка навучання арфаграфіі. Прыёмы выпрацоўкі правапісных уменняў і навыкаў з улікам прынцыпаў сучаснай беларускай арфаграфіі, характару напісанняў, этапаў навучання. Роля зрокавых, слыхавых,

кінестэзічных аналізатараў у фарміраванні арфаграфічных дзеянняў. Прыёмы і формы выпрацоўкі ўменне вызначаць арфаграфічную задачу, парадак арфаграфічнага дзеяння, хутка і беспамылкова падбіраць праверачныя словы.

Асноўныя прыёмы працы з арфаграфічным правілам. Фарміраванне ў вучняў умення прымяняць арфаграфічныя правілы на пісьме, улічваць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя пры вывучэнні фанетыкі, марфемнай будовы слова, граматыкі.

Арфаграфічныя практыкаванні: розныя віды спісвання, дыктантаў, граматыка-арфаграфічны разбор, лексіка-арфаграфічныя практыкаванні, пераказы. Праца з арфаграфічным слоўнікам. Умовы выпрацоўкі арфаграфічнага навыку.

Класіфікацыя арфаграфічных памылак на аснове аналізу вучнёўскіх пісьмовых прац, іх выпраўленне і прыёмы папярэджання.

## РАЗДЗЕЛ 5. МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ

### Тэма 5.1. НАВУКОВЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ

Паняцці “мова”, “маўленне”, “мысленне” Узаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь мовы, маўлення, мыслення. Віды маўлення: унутранае, знешняе, вуснае, пісьмовае, маналагічнае, дыялагічнае.

Маўленчая дзейнасць. Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо.

Мэты і змест працы па развіцці маўлення навучэнцаў пачатковых класаў. Прынцыпы методыкі развіцця маўлення. Задачы развіцця маўлення вучняў.

Патрабаванні да вуснага і пісьмовага маўлення дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Умовы паспяховага развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў.

### Тэма 5.2. НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

Выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення. Недахопы вуснага маўлення навучэнцаў, іх прычыны. Кірункі працы па засваенні вучнямі арфаэпічных нормаў. Прыёмы работы па выпрацоўцы выразнасці вуснага маўлення навучэнцаў.

Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў. Задачы, змест і методыка лексічнай працы на ўроках мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах. Прыёмы семантызацыі слоў. Слоўнікава-семантычная і слоўнікава-стылістычная праца на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання. Гульні і займальныя практыкаванні са словамі на ўроках мовы і літаратурнага чытання.

Граматычны ўзровень працы па развіцці маўлення. Словазлучэнне і сказ – аснова развіцця звязнага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў. Словаформа як адзінка мовы і маўлення. Асаблівасці засваення вучняміграматычных форм. Задачы і змест працы над граматычнай формай слова ў аспекце развіцця маўлення. Тыпалогія практыкаванняў: практыкаванні, накіраваныя на засваенне вучнямі абмежаванняў ва ўтварэнні і спалучальнасці граматычных форм, на ўсведамленне сэнсавых і выяўленчых магчымасцей граматычных форм, на развіццё ўменняў мэтазгодна выкарыстоўваць граматычныя формы ў звязным маўленні.

Фарміраванне камунікатыўных уменняў – асноўны змест працы па развіцці звязнага маўлення.

## Тэма 5.3. СІСТЭМА ПРАЦЫ ПА РАЗВІЦЦІ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ

Задачы, змест працы па развіцці звязнага маўлення. Прапедэўтычныя лінгвістычныя веды, якія павінны набыць вучні пачатковых класаў: паняцце пра тэкст, тэму, структуру і галоўную думку выказвання. Выпрацоўкаўменняпадбіраць да выказвання загалоўкі, вызначаць тып тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне), яго структуру, назапашваць фактычны матэрыял да творчых прац розных відаў.

Пераказ як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Віды пераказаў, агульныя патрабаванні да вусных і пісьмовых пераказаў. Асаблівасці працы над падрабязным, сціслым, выбарачным і творчым пераказам. Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы пераказаў, папярэджанне памылак. Структура ўрока напісання пераказу. Напісанне і праверка пераказаў вучнямі.

Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў.

Віды сачыненняў па крыніцах выкарыстоўваемага матэрыялу: па асабістых назіраннях і ўражаннях, па ўласным вопыце, па матэрыялах экскурсій, па прачытаных творах, па сюжэтных малюнках і серыях малюнкаў, па прагледжаных фільмах, спектаклях, тэлеперадачах. Сачыненні з выкарыстаннем матэрыялаў з розных крыніц. Віды сачыненняў па тыпах тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне, сачыненні змешанага тыпу. Разнавіднасці сачыненняў (калектыўныя і індывідуальныя) у залежнасці ад ступені ўдзелу настаўніка і класа ў іх падрыхтоўцы. Сачыненні-мініяцюры, іх асаблівасці і месца ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў.

Методыка работы па падрыхтоўцы і напісанні сачыненняў: збор матэрыялу, яго сістэматызацыя і абагульненне, вызначэнне зместу будучага выказвання, складанне плана. Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы сачынення, папярэджанне памылак. Структура ўрока напісання сачынення.

Праверка вучнёўскіх пісьмовых творчых прац. Тыпы памылак, іх выпраўленне, улік і класіфікацыя, прыёмы ліквідацыі. Арганізацыя працы над памылкамі. Нормы ацэнкі творчых прац.

# ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў важнае месца займае навукова-даследчая работа студэнтаў, у прыватнасці такая яе форма арганізацыі, як напісанне і абарона курсавога праекта.

Курсавая работа ўяўляе сабой лагічна завершаны і аформлены ў выглядзе тэксту твор навукова-даследчага зместу, накіраваны на вырашэнне пэўных праблем і задач у галіне методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання.

Выкананне курсавой работы накіравана на дасягненне наступных мэт:

- сістэматызацыя, абагульненне, замацаванне і паглыбленне тэарэтычных і практычных ведаў па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання;
- удасканаленне навыкаў прымянення атрыманых ведаў для рашэння канкрэтных задач, а таксама навыкаў самастойнай работы з навуковай літаратурай і апрацоўкі вынікаў тэарэтычных або эксперыментальных даследаванняў.

Тэма курсавой работы зацвярджаецца на кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі, а заданне на яе выкананне афармляецца кіраўніком.

**Прыкладны аб'ём работы** (без дадаткаў і спісу літаратуры) у камп'ютарным варыянце – 25-40 старонак (шрыфт – TimesNewRoman, 14 пт, міжрадковы інтэрвал – 1, колькасць радкоў на старонцы – 38–42). Левае поле – 30 мм, правае – 15 мм, верхняе і ніжняе – 20 мм.

У агульную нумарацыю ўключаюцца тытульны ліст і змест, хоць на іх нумар старонкі не ставіцца. На астатніх старонках нумар ставіцца справа або ў цэнтры старонкі зверху.

Кожную структурную частку – УВОДЗІНЫ, ГЛАВЫ, ЗАКЛЮЧЭННЕ, СПІС ЛІТАРАТУРЫ, ДАДАТАК – трэба пачынаць з новай старонкі.

## Структура курсавой працы

Стурктура курсавой працы павінна спрыяць раскрыццю выбранай тэмы і яе састаўных элементаў. Усе часткі курсавой працы павінны быць узаемазвязаны і выкладзены ў лагічнай паслядоўнасці. Структура працыўключае заданне, тытульны ліст, змест, уводзіны, асноўную частку, заключэнне, бібліяграфічны спіс, дадаткі.

На **тытульным лісце** пазначаюцца: поўная назва ўстановы адукацыі і назва кафедры, тэма, звесткі пра аўтара (факультэт, курс, прозвішча, імя, імя па бацьку), вучоная ступень і вучонае званне, прозвішча і ініцыялы навуковага кіраўніка; месца і год выканання працы.

**Змест** уяўляе сабой паслядоўны пералік пунктаў і падпунктаў курсавой працы. Усе загалоўкі пачынаюцца з вялікай літары, кропкі не ставяцца. Пунктам *Уводзіны, Заключэнне, Бібліяграфічны спіс* парадкавы нумар не прысвойваецца.

**Уводзіны** ўключаюць абгрунтаванне выбару тэмы, яе актуальнасці, вызначэнне аб’екта, прадмета, мэты, задач, метадаў і базы даследавання (кожная рубрыка пачынаецца з чырвонага радка, назва рубрыкі вылучаецца іншым шрыфтам ці падкрэсліваннем).

Пры абгрунтаванні выбару і *актуальнасці тэмы* даследавання неабходна звярнуць увагу на ступень яе вывучанасці (сцісла асвяціць гісторыю пытання) і сфармуляваць праблему (назваць тое, што трэба вывучыць).

*Аб’ект і прадмет* даследавання суадносяцца як цэлае і частка. *Аб'ект* – сфера, галіна пошуку, тая частка навукі ці практыкі, з якой даследчык непасрэдна мае справу; *прадмет* – абмежаваны аспект сферы пошуку ўнутры аб'екта, той бок, той пункт гледжання, з якім даследчык спасцігае цэласны аб'ект, вылучаючы пры гэтым найбольш істотныя прыметы аб'екта. Напрыклад, *аб’ект даследавання* – працэс фарміравання ведаў, а *прадмет* – фарміраванне якасці ведаў.

*Мэта даследавання* – тое, што ў агульным выглядзе павінна быць дасягнута падчас працы. Фармулюецца з выкарыстаннем дзеясловаў абрунтаваць ролю, раскрыць, паказаць, устанавіць, распрацаваць і інш. *Задачы* вынікаюць з мэты і канкрэтызуюць яе (напрыклад, вывучыць, вызначыць, выявіць, абагульніць, праверыць у вопытнай працы, апрабіраваць і г.д.).

*Метады даследавання* вызначаюцца з улікам спецыфікі задач. Могуць быць выкарыстаны: *метады тэарэтычнага пошуку* – аналіз навуковай і метадычнай літаратуры; вывучэнне метадалагічных асноў методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах, вывучэнне гісторыі праблемы, аналіз і абагульненне матэрыялаў, атрыманых эмпірычным шляхам; *метады даследавання педагагічнага працэсу* – назіранне за працэсам навучання, вывучэнне пісьмовых прац, тэсціраванне, мадэліраванне, гутарка, апытанне, анкетаванне, аналіз і абагульненне вопыту (масавага і перадавога), аналіз дакументацыі; *эксперымент* – пошукавы, канстатуючы, навучальны, кантрольны;*метады матэматычнай статыстыкі* – сярэдні паказчык, рэгістрацыя, ранжыраванне і г.д.

*База даследавання*: указваецца вучэбная ўстанова (нумар школы, класа), дзе праводзілася даследаванне, колькасць выкарыстаных тэарэтычных крыніц.

*Практычная значнасць:* акрэсліваецца, кім і калі могуць быць выкарыстаны матэрыялы, атрыманыя ў ходзе даследавання.

У **асноўнай частцы** вылучаюцца главы, якія пры неабходнасці падзяляюцца на параграфы (іх не трэба афармляць з новай старонкі). Змест структурных частак адпавядае пастаўленым задачам: разглядаецца гістарычны і тэарэтычны аспекты праблемы даследавання, прыводзіцца крытычны аналіз навуковай і метадычнай літаратуры, асноўныя тэарэтычныя палажэнні пацвярджаюцца адказамі вучняў, вытрымкамі з іх пісьмовых работ, фрагментамі ўрокаў, вынікамі эксперыменту, лічбавымі данымі. Студэнт аналізуе змест навучання, абгрунтоўвае выбар метадаў, прыёмаў,

сродкаў навучання і кантролю, адказвае на пытанні: «З якой мэтай вучыць?», «Чаму вучыць?», «Як вучыць?», «Чаму так вучыць, а не інакш?», «Як кантраляваць засвоенае?» Кожная глава завяршаецца вывадамі або канстатацыяй вынікаў.

Спасылкі на літаратуру ў тэксце курсавой працы афармляюцца ў квадратныя дужкі: [5] – спасылка на запіс у спісе літаратуры, [5, с.8] – спасылка з указаннем старонак працытаванай працы, [3;5;7] – спасылка на шэраг прац.

**Заключэнне** можа быць прадстаўлена ў выглядзе абагульненых вывадаў па кожнай главе, дзе акрэсліваецца значэнне праведзенай працы для паляпшэння якасці навучання, даюцца практычныя рэкамендацыі, раскрываюцца далейшыя перспектывы даследавання тэмы.

**Бібліяграфічны спіс** падаецца ў алфавітным парадку з захаваннем бібліяграфічных патрабаванняў па схеме: прозвішча, ініцыялы аўтара; загаловак; тэматыка, від, назначэнне дакумента; звесткі аб адказнасці (складальнікі, рэдактары); звесткі аб выданні (месца і час выдання); аб’ём. У спіс уключаюцца ўсе крыніцы, выкарыстаныя ў ходзе даследавання (не менш за 20–25).

**Дадаткі** ўключаюць схемы, табліцы, дыяграмы, дадатковыя матэрыялы даследавання. Кожны дадатак афармляецца на асобных лістах і мае свой тэматычны загаловак. У правым верхнім вугле ўказваецца парадкавы нумар «Дадатак 1», «Дадатак 2». Нумарацыя старонак працягваецца ў былым парадку.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
(дзённая форма атрымання адукацыі)
**2 курс, 4 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная работа | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 9 |
| 1.<br><br>1.1 | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы**<br>Методыка выкладання беларускай мовы як навука<br>*Пытанні:*<br>*1) Прадмет, задачы і змест курса методыкі выкладання беларускай мовы.2) Прынцыпы навучання роднай мове ў пачатковай школе.*3) *Метады даследавання ў методыцы выкладання беларускай мовы.4) Структура курса методыкі беларускай мовы.5)Месца методыкі пачатковага навучання сярод іншых навук.*<br>*6) Новыя тэхналогіі ў сістэме навучання малодшых школьнікаў мове, актуальныя праблемы методыкі выкладання беларускай мовы на розных этапах.* | 2 | | | | 5 | Прэзентацыя | асн. [1], [2] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *7) Кароткі гісторыка-крытычны агляд методыкі пачатковага навучання мове і чытанню. 8) Роля К М. Міцкевіча (Я. Коласа) у станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы. 9) Найноўшыя навуковыя даследаванні ў галіне навучання малодшых школьнікаў беларускай мове.*<br>*Заданні для самастойнай работы:*<br>*1) Пазнаёміцца з «Другім чытаннем для дзяцей беларусаў», вызначыць тэматыку твораў, заканспектаваць 3 творы.*<br>*2) Пазнаёміцца з «Методыкай роднай мовы» Я. Коласа, зрабіць канспект (асноўныя раздзелы, важныя палажэнні кожнага раздзела).*<br>*3) Пазнаёміцца з апошнімі навуковымі даследаваннямі ў галіне навучання малодшых школьнікаў беларускай мове і на гэтай аснове падрыхтаваць паведамленне па адным* з актуальных *пытанняў методыкі выкладання беларускай мовы* | | | | **2 пр** | | Я. Колас «Методыка роднай мовы» | асн.<br>[1], [2] | Праверка канспектаў |
| 1.2. | Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах<br>*Пытанні:*<br>*1) Значэнне беларускай мовы у сістэме школьнай адукацыі, у фарміраванні інтэлектуальна развітай асобы.2) Задачы навучання мове ў пачатковых класах.3)Змест моўнай адукацыі ў сучаснай школе. 4) Месца роднай (беларускай) мовы ў вучэбных планах і праграмах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (I ступень агульнай сярэдняй адукацыі). 5)Развіццёвыя магчымасці прадмета «Беларуская мова», яго выхаваўчае значэнне.* | 2 | | | | 3 | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мовамі навучання, падручнікі | асн.<br>[1], [2]<br>дад.<br>[8] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Практычныя заданні:*<br>*1)Прааналізаваць адукацыйны стандартпачатковай адукацыі і вылучыць акрэсленыя ў ім прадметныя вынікі асваення зместу праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».*<br>*2) Прааналізаваць праграмы па беларускай мове для 1- 4 класаў і вызначыцьпрынцыпы пабудовы праграмы;агульнае і спецыфічнае ў раздзелах праграм устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.*<br>*3)Прааналізавацьзмест і структуру падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларускай мове для пачатковых класаў* | | 2 | | | | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мовамі навучання, падручнікі | асн. [1], [2] дад. [8] | Канспект выкананых заданняў |
| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Пытанні:* *1) Узаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь мовы, маў-лення, мыслення. 2) Віды маўлення. 3) Маўленчая дзейнасць. Віды маўленчай дзейнасці. 4) Мэты і змест працы па развіцці маўлення малодшых школь-нікаў. 5) Прынцыпы методыкі развіцця маўлення. 6) Задачы развіцця маўлення вучняў. 7) Патра-баванні да вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў. 8) Умовы паспяховага развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў.* | 2 | | | па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. наву-чання, прэзентацыя | асн. [1], [2], дад.[12] | Праверк а канспект аў |
| 5.2 | Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў *Практычныязаданні:* *1) Прааналізаваць відэазапіс ўрока літара-турнага чытанняі вылучыць прыёмы выпрацоўкі навыкаў літаратурнага вымаўлення, прыёмы арганізацыі слоўнікавай працы.* *2) На аснове аналізу дапаможніка длянастаўнікаў ахарактарызаваць методыку работы па развіцці звязнага маўлення навучэнцаў.* | | 2 | | Дапаможнік для настаўні-каў: В.І.Сві-рыдзенка, Н.У.Антонава Беларуская мова. 2- 4 кла-сы. Навучаль-ныя пераказы | асн. [1], [2], дад.[12] | Канспек т выканан ых заданняў |
| | **Усяго за семестр** | **8** | **8** | **4** | | | |
| **4 курс, 8 семестр** | | | | | | | |
| **экзамен** | | | | | | | |

**ВУЧЕБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**

завочная форма атрымання адукацыі (3,5 гады навучання)

**1 курс, 4 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю знаняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 7 | 8 | 9 |
| 1.<br>1.1 | **Методыка навучання грамаце**<br>Сучасны гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучання грамаце<br>*Пытанні:*<br>*1)Гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучан-ня грамаце, яго адукацыйнае і выхаваўчае зна-чэнне. 2) Прыметы сучаснага метаду навучання грамаце. 3) Развіццё маўлення і мыслення пры на-вучанні грамаце. 4) Словаўтваральная, граматыч-ная і арфаграфічная прапедэўтыка пры навучанні грамаце. 5) Авалоданне нормамі літаратурнага вымаўлення. 6) Працэс навучання грамаце з улікам перыядаў (падрыхтоўчы, асноўны, заключны). 7) Сучасны вучэбна-метадычны комплекс па навучанні грамаце.* | 2 | | | Буквар, праграма па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. мовай навучання, прэзентацыя | асн. [1], [2] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.<br><br>2.1 | **Методыка класнага і пазакласнагачытання**<br>Якасці паўнацэннага навыку чытання і шляхі яго выпрацоўкі<br>*Практычныя заданні:*<br>*1) Ахарактарызаваць і падабраць прыёмы выпрацоўкі правільнасці чытання.*<br>*2) Ахарактарызаваць і падабраць прыёмы выпрацоўкі свядомасці чытання.*<br>*3) Ахарактарызаваць і падабраць прыёмы выпрацоўкі бегласці чытання.*<br>*4) Апісаць праверку і ўлік уменняў і навыкаў чытання.* | | 2 | | Праграмы па літ. чыт. для ўстаноў агул. сярэд. адукац., падручнікі па літаратурным чытанні, відэаўрок | асн. [1], [2], дад. [6], [7] | Канспект выкананых заданняў |
| 2.2 | Этапы працы з мастацкім творам<br>*Пытанні:*<br>*1) Этапы працы з мастацкім творам. 2) Задачы і характар заданняў пры чытанні і аналізе мастацкага твора. 3) Першаснае чытанне і праверка эмацыянальнага ўспрымання прачытанага. 4) Аналіз зместу твора ў адзінстве з яго формай. 5) Гутарка як метад працы на ўроках літаратурнага чытання, яе віды, формы правядзення. 6) Віды вусных пераказаў, методыка іх правядзення. 7) Падрыхтоўчая праца да пераказу, яе змест, характар заданняў і пытанняў. 8) Навучанне складанню плана прачытанага тэксту. 9) Літаратурная творчасць вучняў пры чытанні і аналізе мастацкіх твораў: драматызацыя і інсцэніраванне, апавяданні па аналогіі з прачытаным, дамысліванне лёсу герояў, развіццё пэўных падзей, што разглядаліся ў творы, складанне дыялогаў, невялікіх казак, загадак. 10) Асноўныя тыпы ўрокаў літаратурнага чытання, іх структурныя кампаненты.* | 2 | | | Праграмы па літ. чыт. для ўстаноў агул. сярэд. адукац., падручнікі па літаратурным чытанні | асн. [1], [2], дад. [6], [7] | Праверка канспектаў |
| | **Усяго за семестр** | **4** | **2** | | | | |
| | **2 курс, 3 семестр** | | | | | | |
| | | | | | | | **залік** |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.<br><br>3.1 | **Методыка вывучэння асобных тэмшкольнага курса беларускай мовы ў пачатковых класах**<br>Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі. Фарміраванне арфаграфічнага навыку пры вывучэнні фанетыкі<br>*Пытанні:*<br>*1) Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі. 2) Методыка працы над гу-камі, літарамі, складам, націскам. 3) Вызначэнне гукавога і літарнага складу слова. 4) Знаёмства з алфавітам, фарміраванне ўмення карыстацца ім на практыцы. 5) Развіццё мыслення і маўлення дзяцей пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі. 6) Арфаэпічныя памылкі, прычыны іх узнікнення, прыёмы і спосабы папярэджання і выпраўлення.* | 2 | | | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. навучання, падручнікі па беларускай мове | асн. [1], [2], дад. [9], [10], [11] | Праверка канспектаў |
| 3.2 | Вывучэнне марфемнага складу слова. Фарміраванне арфаграфічнага навыку пры вывучэнні марфемнага складу слова<br>*1) Ахарактарызаваць марфемны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення марфемнай структуры слова.*<br>*2) Апісаць прыёмы выпрацоўкі арфаграфічнага навыку на аснове засваення марфемнай будовы слова.*<br>*3) Ахарактарызаваць віды практыкаванняў для вывучэння марфемнай будовы слова і выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў.*<br>*4) Распрацаваць план-канспект урока беларускай мовы па тэме «Роднасныя словы. Корань слова».*<br>*5)Правесці і прааналізаваць урок па тэме «Роднасныя словы. Корань слова».* | | 2 | | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. навучання, падручнікі па беларускай мове | асн. [1], [2], дад. [9], [10], [11] | Праверка канспектаў урокаў |
| 3.3 | Методыка вывучэння элементаў марфалогііў пачатковых класах. Фарміраванне арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы | 2 | | | Праграмы | асн. | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Пытанні:* *1) Задачы і змест працы па вывучэнні часцін мовы ў пачатковых класах. 2) Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах, яе абгрунтаванне. 3) Сістэма вывучэння прыметніка ў 1 – 4 класах. 4) Сістэма вывучэння дзеяслова ў 1 – 4 класах: фарміраванне паняцця «дзеяслоў». 5) Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах. 6) Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах. 7) Навучанне выкарыстанню ў маўленні граматычных кан-струкцый з прыназоўнікамі і злучнікамі. 8) Выпрацоўка арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы.* | | | | па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. наву-чання, падруч-нікі па бела-рускай мове | [1], [2], дад. [9], [10], [11] | |
| 3.4 | Вывучэнне элементаў сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах *Практычныя заданні:* *1) На аснове аналізу праграмы па беларускай мове ахарактарызаваць сінтаксічны матэрыял у 1–4 класах (сказ, віды сказаў па інтанацыі і мэце выказвання, члены сказа, сувязь слоў у сказе, аднародныя члены сказа).* *2) На аснове аналізу праграмы па беларускай мове пералічыць сінтаксічныя веды, уменні і навыкі, якія павінны набыць вучні пры засваенні часцін мовы.* *3) Распрацаваць сістэму практыкаванняў па выпрацоўцы ў малодшых школьнікаў пунктуацыйных навыкаў пры вывучэнні аднародных членаў сказа.* *4) Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Вызначэнне слоў, якія абазначаюць пра каго ці пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца».* | | 2 | | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. наву-чання, падруч-нікі па бела-рускай мове | асн. [1], [2], дад. [9], [10], [11] | Праверка канспектаў урокаў |
| 3.5 | Вывучэнне беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання *Практычныязаданні:* *1) Прааналізаваць відэазапіс ўрока беларускай мовыў 1 класе* | | | 2 | DVD-дадатак да часопіса «Пачатковае | асн. [1], [2], дад. | Праверка канспектаў урокаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *школы з рускай мовай навучання.*<br>*2) Распрацаваць планы-канспекты урокаў бела-рускай мовы па тэмах «Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме», «Значэнне слова» ў 2 класе.* | | | | навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа», 2010, № 5, 6) | [9], [10], [11] | |
| 4<br>4.1 | **Методыка развіцця маўлення вучняў**<br>Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення<br>*Пытанні:*<br>*1) Узаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь мовы, маўлення, мыслення. 2) Віды маўлення. 3) Маўленчая дзейнасць. Віды маўленчай дзейнасці. 4) Мэты і змест працы па развіцці маўлення малодшых школьнікаў. 5) Прынцыпы методыкі развіцця маўлення. 6) Задачы развіцця маўлення вучняў. 7) Патрабаванні да вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў. 8) Умовы паспяховага развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў.* | 2 | | | Праграмы па бел. мов. для ўстаноў агул. сярэд. адукац. з бел. і рус. мов. навучання, прэзентацыя | асн. [1], [2], дад.[12] | Праверка канспектаў |
| | **Усяго за семестр** | **6** | **4** | **2** | | | |
| **2 курс, 4 семестр** | | | | | | | |
| **экзамен** | | | | | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
2. Свірыдзенка, В. І. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання : электронны вучэб.-метад. комплекс па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-01 02 01 Пачатковая адукацыя [Электронны рэсурс] / В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/2236. – Дата доступу: 6.11.2019. (№1141919997 от 6.11.2019)

**Дадатковая**

3. Антонава, Н. У. Пазакласнае чытанне ў 3-4 класах : вучэб.-метад. дапаможнік. для настаўнікаў / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014. – 88 с.
4. Буторына, І. А. Пазакласнае чытанне ў 1 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. А. Буторына. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. – 88 с.
5. Буторына, І. А. Пазакласнае чытанне ў 2 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. А. Буторына. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. – 96 с.
6. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне ў 3 класе : вучэб-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – 152 с.
7. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне ў 4 класе : вучэб-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 192 с.
8. Образовательный стандарт начального образования // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2019. – № 2. – С. 3–15.
9. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 2 кл. / В. І.Свірыдзенка, Н. У. Антонава. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 269 с.
10. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.
11. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.
12. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 280 с.

## *ПЕРАЛІК ЛАБАРАТОРНЫХ РАБОТ*

1. Урокі навучання грамаце ў асноўны перыяд.
2. Урокі чытання і аналізу апавяданняў.
3. Урокі мовы па раздзеле «Гукі і літары» ў 2 класе.
4. Урокі беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання.

## Характарыстыка інавацыйных падыходаў да выкладання вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» прадугледжвае наступныя віды дзейнасці:

а) вучэбную: вывучэнне тэарэтычных асноў методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах,

б) навукова-педагагічную: вывучэнне перадавога педагагічнага вопыту ў выкладанні беларускай мовы на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі,

в) практычную: асваеннне прадуктыўных педагагічных метадаў і прыёмаў выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах.

На лекцыйных занятках выкладаюцца асноўныя палажэнні і паняцці, неабходныя для засваення матэрыялу дысцыпліны. Выклад асноўнага лекцыйнага матэрыялу суправаджаецца камп'ютарнымі прэзентацыямі.

Практычныя заняткі праводзяцца з выкарыстаннем актыўных і інтэрактыўных метадаў педагагічнага ўзаемадзеяння, сярод якіх праектная дзейнасць, ролевыя гульні, круглыя сталы і інш. Рыхтуючыся да практычных заняткаў, студэнты ўключаюцца ў групавыя формы ўзаемадзеяння, рыхтуюць тэматычныя паведамленні, распрацоўваюць планы-канспекты і фрагменты ўрокаў, вучацца планаваць і арганізоўваць сваю самастойную работу, весці дыялог і адстойваць свой пункт погляду.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа з'яўляецца спецыфічным педагагічным сродкам арганізацыі і кіравання самастойнай дзейнасцю студэнтаў у вучэбным працэсе. Самастойная работа студэнтаў (СРС) фарміруе гатоўнасць да самаадукацыі, стварае базу непарыўнай адукацыі, магчымасць пастаянна павышаць сваю кваліфікацыю.

Мэта самастойнай работы – садзейнічаць аптымальнаму засваенню студэнтамі вучэбнага матэрыялу, развіваць іх пазнавальную актыўнасць, рыхтаваць да самаадукацыі.

Задачы самастойнай работы:

- паглыбленне і сістэматызацыя ведаў,
- пастаноўка і рашэнне пазнавальных задач,
- развіццё аналітыка-сінтэтычных здольнасцей разумовай дзейнасці, уменняў працаваць з рознай па аб'ёме інфармацыяй, вучэбнай і навуковай літаратурай,
- практычнае прымяненне ведаў, уменняў,
- развіццё навыкаў арганізацыі самастойнай вучэбнай працы і кантролю за яе эфектыўнасцю.

Арганізацыя СРС можа ўключаць у сябе наступныя тэхналагічныя складнікі:

1) адбор мэт самастойнай работы (падставамі адбору мэт з’яўляюцца мэты, вызначаныя адукацыйным стандартам і вучэбнай праграмай дысцыпліны);

2) адбор зместу СРС (падставамі адбору зместу самастойнай работы з’яўляюцца адукацыйны стандарт, крыніцы самаадукацыі (літаратура, самааналіз), індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў (абучальнасць, абучанасць, інтэлект, матывацыя, асаблівасці вучэбнай дзейнасці));

3) канструяванне заданняў (заданні для самастойнай работы павінны адпавядаць мэтам рознага ўзроўню, адлюстроўваць змест дысцыпліны, якая вывучаецца, уключаць розныя віды і ўзроўні пазнавальнай дзейнасці студэнтаў);

4) арганізацыя кантролю (уключае ўважлівы адбор сродкаў кантролю, вызначэнне этапаў, распрацоўку індывідуальных форм кантролю).

Для эфектыўнасці СРС неабходна выканаць шэраг умоў:

1) забеспячэнне правільнага спалучэння аб’ёмаў аўдыторнай і самастойнай работы;

2) метадычна правільная арганізацыя работы;

3) забеспячэнне студэнта неабходнымі метадычнымі матэрыяламі;

4) кантроль за арганізацыяй і ходам самастойнай работы і сродкаў заахвочвання студэнта да якаснага яе выкананне.

Для СРС прапануюцца заданні па тэмах, асноўны матэрыял якіх разгледжаны на аўдыторных занятках, індывідуальныя заданні закліканыя пашырыць кругагляд студэнтаў, паглыбіць іх веды, развіць уменні даследчай і творчай дзейнасці.

Пры вывучэнні дысцыпліны арганізацыя СРС уяўляе адзінства ўзаемазвязаных форм:

- аўдыторная самастойная работа (на лекцыях, практычных занятках), якая здзяйсняецца пад непасрэдным кіраўніцтвам выкладчыка;
- пазааўдыторная самастойная работа (па-за раскладам: на кансультацыях па вучэбных пытаннях, у ходзе творчых кантактаў, пры выкананні студэнтам вучэбных і творчых задач, пры ліквідацыі запазычанасцей, пры выкананні індывідуальных заданняў і г.д.).

СРС можа быць індывідуальнай, парнай і групавой. Для эфектыўнай вучобы студэнт павінен валодаць метадамі планавання і арганізацыі самастойнай работы з вучэбным матэрыялам, навыкамі самаадукацыі.

Віды самастойнай работы разнастайныя:

- падрыхтоўка і напісанне рэфератаў, анатацый, эсэ і іншых пісьмовых работ на зададзеныя тэмы;
- падбор і аналіз літаратурных крыніц;
- распрацоўка і складанне схем, табліц;
- падрыхтоўка фрагментаў і канпектаў урокаў.

СРС студэнтаў адбываецца ў форме дзелавога ўзаемадзеяння: студэнт атрымлівае непасрэдныя рэкамендацыі выкладчыка па арганізацыі і змесце самастойнай дзейнасці, выкладчык выконвае функцыю кіравання (праз улік, кантроль і карэкцыю памылковых дзеянняў) і ацэнку вынікаў.

## Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў

| № п//п | Назва тэмы, раздела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 5 | Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад школа», вызначыць тэматыку артыкулаў, прысвеча-ных актуальным пы-танням методыкі вы-кладання беларускай мовы ў пачатковых класах.<br>Падрыхтаваць анатацыі 5 артыкулаў. | вусная<br>пісьмовая |
| 1.2 | Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах | 3 | Падрабязна ахарактарызаваць усе кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове для 2, 3 або 4 класа . | пісьмовая |
| 2.1 | Навуковыя асновы методыкі навучання грамаце | 2 | Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад школа», вызначыць тэматыку артыкулаў, прысвеча-ных актуальным пы-танням методыкі на-вучання грамаце.<br>Падрыхтаваць анатацыі 2 артыкулаў. | вусная<br>пісьмовая |
| 2.2 | Сучасны гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучання грамаце | 2 | Падрабязна ахарактарызаваць усе дадатко-выя кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу па навучанні грамаце. | пісьмовая |
| 2.3 | Арганізацыя і змест працы ў падрыхтоўчы перыяд навучання | 2 | На аснове аналізу вучэбна-метадычнага дапаможніка па чы-танні вызначыць пла-нуемыя вынікі наву-чання | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | грамаце | | (прадметныя, метапрадметныя, асобасныя) па заканчэнні падрыхтоўчага перыяду навучання грамаце | пісьмовая |
| 2.4 | Арганізацыя і змест працы ў асноўны перыяд навучання грамаце | 2 | На аснове аналізу вучэбна-метадычнага дапаможніка па навучанні чытанню вызначыць плануемыя вынікі навучання (прадметныя, метапрадметныя, асобасныя) па заканчэнні асноўнага перыяду навучання грамаце. | пісьмовая |
| 2.5 | Навучанне пісьму ў асноўны перыяд навучання грамаце | 3 | На аснове аналізу вучэбна-метадычнага дапаможніка па навучанні пісьму вызначыць прадметныя, метапрадметныя, асобасныя вынікі навучання пісьму першакласнікаў. | пісьмовая |
| 2.6. | Развіццё маўлення і мыслення вучняў у перыяд навучання грамаце | 3 | Ахарактарыхаваць сістэму працы па развіцці маўлення, прадстаўленую ў буквары | пісьмовая |
| 3.1. | Сістэма класнага чытання ў сучаснай школе | 3 | Параўнаць будову і змест падручнікаў па літаратурным чытанні для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання; адзначыць падабенства і адрозненні ў змесце. | пісьмовая |
| 3.2 | Якасці паўнацэннага навыку чытання і шляхі яго выпрацоўкі | 2 | Падрыхтаваць сістэ-му практыкаванняў па выпрацоўцы дыкцыі і правільнага дыхання навучэнцаў 2 (3 або 4 класа). | вусная |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3.3 | Этапы працы з мастацкім творам | 3 | Распрацаваць фраг-мент урока літаратур-нага чытання з выка-рыстаннем заданняў, накіраваных на развіццё літаратурнай творчасці навучэнцаў: драматызацыя і інсцэніраванне, апавяданні па аналогіі з прачытаным і інш. | пісьмовая |
| 3.4 | Асаблівасці чытання і аналізу твораў розных жанраў | 3 | Распрацаваць план-канспект падагуль-няльнага ўрока па ад-ным з раздзелаў пад-ручніка па літаратур-ным чытанні для 2, 3 і 4 класа | пісьмовая |
| 3.5 | Праца з прыказкамі, прымаўкамі і загадкамі на ўроках мовы і літаратурнага чытання | 3 | Вызначыць тэматыку прыказак у падручні-ку па літаратурным чытанні для 2, 3 або 4 класа; паказаць прыё-мы працы, накірава-ныя на тлумачэнне значэння кожнай з гэ-тых прыказак.<br>Праілюстраваць пры-кладамі віды працы, накіраваныя на наву-чанне дзяцей скла-данню загадак. | пісьмовая<br>вусная |
| 3.6 | Задачы і арганізацыя пазакласнага чытання ў пачатковых класах | 4 | Прааналізаваць раздзел праграмы па лі-таратурным чытанні «Фарміраванне самас-тойнай чытацкай дзейнасці з кнігай», вызначыць патраба-ванні да фарміраван-ня навыкаў чытацкай самастойнасці па кла-сах.<br>Распрацаваць план-канспект пазаклас-нага мерапыемства, накіраванага на пра-паганду кнігі. | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 3.7 | Урокі | 4 | Распрацаваць план- | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | пазакласнага чытання | | канспект урока пазакласнага чытання па апавяданнях з кнігі «Ніколі не забудзем». Распрацаваць план-канспект музейнага ўрока пазакласнага чытання. | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4.1 | Лінгвістычныя і псіхолага-педагагічныя асновы навучання беларускай мове | 4 | Пазнаёміцца з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская мова», заканспекта-ваць яе асноўныя па-лажэнні. Указаць асноўныя і дадатковыя кампаненты ВМК па беларускай мове. | пісьмовая<br>вусная |
| 4.2 | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 4 | Распрацаваць фрагмент урока з выкарыстаннем метаду моўнага аналізу. Распрацаваць фрагмент урока з выкарыстаннем метаду моўнага канструявання. Распрацаваць фрагмент урока з выкарыстаннем метаду гульні. | пісьмовая<br>пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4.3. | Урок беларускай мовы | 4 | Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад школа»за апошнія два гады, заканспектаваць узор-ныя аўтарскія ўрокі па беларускай мове, якія сустрэліся ў ча-сопісах. | пісьмовая |
| 4.4 | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі. Фарміраванне афаграфічнага навыку пры вывучэнні фанетыкі | 5 | Прааналізаваць раз-дзел праграмы па бе-ларускай мове «Гукі і літары», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў, якія фарміруюцца ў навучэнцаў пры вывучэнні раздзела. Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Галосныя гукі [о], | вусная |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | [э]-[а]. Правапіс слоў з літарамі о,э-а». Распрацаваць план-канспект урока па тэ-ме «Правапіс слоў з літарамі е,ё – я». | пісьмовая<br><br>пісьмовая |
| 4.5 | Метадычныя асновы фарміра-вання граматыч-ных і словаўтва-ральных паняц-цяў. Фарміра-ванне арфагра-фічнага навыку пры вывучэнні элементаў граматыкі і словаўтварэння | 5 | Прааналізаваць пад-ручнікі па беларускай мове для 2 – 4 класаў, вылучыць віды і колькасць практыка-ванняў, якія праду-гледжваюць фарміра-ванне ў навучэнцаў навыкаў граматыч-нага разбору. Прааналізаваць праг-рамы па беларускай мове для 3–4 класаў Вызначыць віды арфаграм, якія за-свойваюцца навучэн-цамі пры вывучэнні тэм «Склад слова»,«Часціны мовы». | пісьмовая<br><br>пісьмовая |
| 4.6 | Вывучэнне марфемнага складу слова. Фарміраванне арфаграфічнага навыку пры вывучэнні марфемнага складу слова | 5 | Распрацаваць план-канспект урока бела-рускай мовы па тэме «Правапіс прыставак якія заканчваюцца на з-, с-». Распрацаваць план-канспект урока бела-рускай мовы па тэме «Апостраф у словах з прыстаўкамі». Распрацаваць план-канспект урока бела-рускай мовы па тэме «Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса». | пісьмовая<br><br>пісьмовая<br><br>пісьмовая |
| 4.7 | Методыка вывучэння элементаў марфалогіі ў пачатковых класах. Фарміраванне | 5 | Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі». Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Скланенне прыметнікаў | пісьмовая |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы | | множнага ліку». Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Займеннік як часціна мовы». | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4.8 | Вывучэнне элементаў сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах | 5 | Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Тыпы сказаў». Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Дадзеныя члены сказа». Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Аднародныя члены сказа». | пісьмовая<br>пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4.9 | Вывучэнне беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання | 5 | Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах». Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах». | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4.10 | Выпрацоўка арфаграфічных уменняў і навыкаў | 5 | На аснове аналізу ме-тадычнай літаратуры ахарактарызаваць розныя віды дык-тантаў. Распрацаваць план-канспект урока бела-рускай мовы ў 2 класе з выкарыстаннем папераджальнага дыктанта. Распрацаваць план-канспект урока правя-дзення кантрольнага дыктанта ў 3 класе. | вусная<br>пісьмовая<br>пісьмовая |
| 5.1 | Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення | 5 | Прааналізаваць праг-раму па навучанні грамаце, вылучыць змест працы па раз-віцці маўлення вуч-няў на ўроках навучання грамаце. Прааналізаваць праграму па літаратурным чытанні | вусная |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | для 2–4 кла-саў, вылучыць змест працы па развіцці маўлення вучняў на ўроках літаратурнага чытання.<br>Прааналізаваць праг-раму па беларускай мове для 2–4 класаў, вылучыць змест пра-цы па развіцці маў-лення вучняў на ўро-ках беларускай мовы. | вусная<br>вусная |
| 5.2 | Напрамкі развіцця маўлення вучняў пачатковых класаў | 5 | Прааналізаваць пад-ручнікі па літара-турным чытанні для 2–4 класаў, вылучыць заданні, накіраваныя на рэалізацыю розных напрамкаў працы па развіцці маўлення вучняў.<br>Прааналізаваць пад-ручнікі па беларускай мове для 2-4 класаў, вылучыць заданні, накіраваныя на рэалі-зацыю розных напрамкаў працы па развіцці маўлення вучняў. | вусная<br>вусная |
| 5.3 | Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў | 3 | На аснове аналізу метадычнай літара-туры парыхтаваць па-ведамленне пра асаб-лівасці працы над са-чыненнем: а) па серыі малюнкаў, б) на ас-нове ўласных назіран-няў, в) на аснове рэпрадукцыі карціны. | вусная |

**Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне**

Кіруемая самастойная работа мяркуе правядзенне 3 лекцыйных (6 г.) і 6 (12 г.) практычных заняткаў:

**Лекцыйныя заняткі:**

Тэма: **«Развіццё маўлення і мыслення вучняў у перыяд навучання грамаце»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім асвятліць наступныя пытанні: а) прынцыпы развіцця маўлення пры навучанні грамаце; б) выпраўленне дэфектаў дыкцыі; в) выпрацоўка гукавой культуры маўлення; г) узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў; д) праца са словазлучэннем і сказам.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі і падабраць сістэму практыкаванняў па развіцці маўлення і мыслення вучняў на уроках навучання чытанню.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі іраспрацаваць сісітэму практыкаванняў па развіцці маўлення і мыслення вучняў на уроках навучання пісьму.

Тэма: **«Урокі пазакласнага чытання»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступнае пытанне: урокі пазакласнага чытання на пачатковым і асноўным этапах.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступнае пытанне: урокі пазакласнага чытання на пачатковым і асноўным этапах.Заканспектаваць тры урокі пазакласнага чытання.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступнае пытанне: урокі пазакласнага чытання на пачатковым і асноўным этапах.На аснове аналізу гатовых планаў-канспектаў урокаў пазакласнага чытання распрацаваць уласны план-канспект урока пазакласнага чытання

Тэма: **«Урок беларускай мовы»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступныя пытанні: а) урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў; б) патрабаванні да ўрокаў граматыкі і правапісу.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступныя пытанні: а) урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў; б) патрабаванні да ўрокаў граматыкі і правапісу.Падрыхтаваць план-канспект традыцыйнага ўрока беларускай мовы любога тыпу.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, які адлюстроўвае наступныя пытанні: а) урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў; б) патрабаванні да ўрокаў граматыкі і правапісу.Падрыхтаваць план-канспект нетрадыцыйнага ўрока беларускай мовы любога тыпу.

**Практычныя заняткі:**

Тэма: **«Методыка выкладання беларускай мовы як навука»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

Пазнаёміцца з «Другім чытаннем для дзяцей беларусаў», вызначыць тэматыку твораў, законспектаваць 3 творы.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Пазнаёміцца з «Методыкай роднай мовы» Я. Коласа, зрабіць канспект (асноўныя раздзелы, важныя палажэнні кожнага раздзела).

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Пазнаёміцца з апошнімі навуковымі даследаваннямі ў галіне навучання малодшых школьнікаў беларускай мове і на гэтай аснове падрыхтаваць паведамленне па адным з актуальных пытанняў методыкі выкладання беларускай мовы.

Тэма: **«Якасці паўнацэннага навыку чытання і шляхі яго выпрацоўкі»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

Падабраць сістэму практыкаванняў, якая дапамагае выпрацаваць у навучэнцаў 2(3 або 4) класа правільнасць чытання.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Распрацаваць сістэму практыкаванняў (па групах), якая дапамагае выпрацаваць у навучэнцаў 2(3 або 4) класа правільнасць і бегласць чытаня.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Распрацаваць сістэму практыкаванняў (па групах), якая дапамагае выпрацаваць у навучэнцаў 2(3 або 4) класа правільнасць, бегласць і выразнасць чытаня. Падрыхтаваць фрагмент урока літаратурнага чытання з выкарыстаннем гэтай сістэмы практыкаванняў

Тэма: **«Асаблівасці чытання і аналізу твораў розных жанраў»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

Падрыхтаваць спіс літаратуры па пытанні "Самастойная праца вучняў, яе характар, віды заданняў, месца падчас аналізу твора".

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Падрыхтоўка планаў-канспектаў урокаў чытання казкі (1 група), байкі (2 група), апавядання (3 група),пейзажнага верша (4 група) з выкарыстаннем самастойнай працы вучняў.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Правядзенне падрыхтаванага ўрока, самааналіз, удзел у абмеркаванні ўрокаў іншых студэнтаў.

Тэма: **«Методыка вывучэння элементаў марфалогіі ў пачатковых класах. Фарміраванне арфаграфічнага навыку пры вывучэнні элементаў марфалогіі»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

Прааналізаваць праграмы па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, адзначыць у канспектах, як падаецца матэрыял па марфалогіі па гадах навучання (1-4 класы).

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Падрыхтаваць нагляднасць, займальны дыдактычны матэрыял для вывучэння назоўніка, прыметніка, дзеяслова ў 2–4 класах.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Падрыхтаваць канспекты ўрокаў і паведамленні па групах.

*1 група:*Як пазнаёміць вучняў 3 класа з родам назоўнікаў, вучняў 4 класа – са скланеннем? Падрыхтаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Назоўнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

З якім арфаграмамі знаёмяцца малодшыя школьнікі пры вывучэнні назоўніка ў пачатковых класах? Распрацаваць сваю сістэму практыкаванняў для засваення адной з пералічаных арфаграм.

*2 група:*Як арганізаваць вывучэнне тэмы «Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у 3 класе»? Як пазнаёміць вучняў 4 класа са скланеннем прыметнікаў? Падрыхтаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Прыметнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

З якім арфаграмамі знаёмяцца малодшыя школьнікі пры вывучэнні прыметніка ў пачатковых класах? Распрацаваць сваю сістэму практыкаванняў для засваення адной з пералічаных арфаграм.

*3 група:* Як пазнаёміць вучняў з сутнасцю спражэння дзеяслова? Падрыхтаваць канспект урока на тэму «Спражэнне дзеясловаў». Якую часціну мовы на гэтым уроку мэтазгодна паўтарыць? Чаму?

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Дзеяслоў», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа»за апошнія 5 гадоў.

З якім арфаграмамі знаёмяцца малодшыя школьнікі пры вывучэнні дзеяслова ў пачатковых класах? Распрацаваць сваю сістэму практыкаванняў для засваення адной з пералічаных арфаграм.

Тэма: **«Вывучэнне беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання вызначыць перыяды вывучэння беларускай мовы як другой.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Распрацаваць план-канспект любога ўрока ў вусным курсе, прадставіць у канспекце матэрыял для фанетычнай зарадкі, дадатковы займальны матэрыял, тэматычна звязаны з дыдактычным матэрыялам практыкаванняў.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Распрацаваць план-канспект урока ва ўступным курсе і план-канспект урока ў вусным курсе. Прадставіць у канспектах матэрыял для фанетычнай зарадкі, дадатковы займальны матэрыял, тэматычна звязаны з дыдактычным матэрыялам практыкаванняў.

Тэма: **«Сістэма працы па развіцці звязнага маўлення вучняў»**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў***

Падрыхтаваць паведамленне на тэму «Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў».

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў***

Падрыхтаваць паведамленне на тэму «Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў». На аснове аналізу метадычнай літаратуры ахарактарызаваць структуру ўрока напісання сачынення.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў***

Падрыхтаваць паведамленне на тэму «Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў». Падрыхтаваць канспекты урокаў напісання сачыненняў розных відаў.

**Пералік сродкаў, што выкарыстоўваюцца для дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання» прадугледжваецца прамежкавая і выніковая ацэнка.

Асноўным сродкам дыягностыкі засваення ведаў і авалодання неабходнымі ўменнямі і навыкамі па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца індывідуальнае і франтальнае апытванне і праверка заданняў розных тыпаў (у тым ліку распрацоўкі планаў-канспектаў урокаў), якія выконваюцца ў межах гадзін, адведзеных на практычныя заняткі і самастойную работу студэнтаў.

У працэсе прамежкавай дыягностыкі ведаў па дысцыпліне прадугледжваецца вуснае і пісьмовае паведамленне, кантрольныя работы, тэсціраванне, залік.

Выніковая ацэнка кампетэнцый прадугледжвае правядзенне экзамену.

## *КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ*
## *ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ*

| Адзнака ў балах | Крытэрыі |
|---|---|
| 1 (адзін) не залічана | Адсутнасць ведаў і кампетэнцый умежах адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі. Адмаўленне ад адказу. Нез'яўленне на атэстацыю без уважлівай прычыны. |
| 2 (два) не залічана | Фрагментарныя ведыў межах адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі. Веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых лагічных памылак. Пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 3 (тры) не залічана | Недастаткова поўны аб'ёмведаўумежах адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі. Веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанненавуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі лагічнымі памылкамі. Слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач. Няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання. Пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 4 (чатыры) залічана | Дастатковы аб'ём ведаўу межах адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі. Засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанненавуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных (тыповых) задач. Уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка рашаць стандартныя (тыповыя) задачы. Уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і даваць ім ацэнку. Праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў. |

| | |
|---|---|
| 5<br>(пяць)<br><br>залічана | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанненавуковай тэрміналогіі, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць вывады. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных і прафесійных задач. Здольнасць самастойна прымяняць тыповыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай. Уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і даваць ім параўнальную ацэнку. Самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 6<br>(шэсць)<br><br>залічана | Дастаткова поўныя ісістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя вывады. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных і прафесійных задач. Здольнасць самастойна прымяняць тыповыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай. Уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і даваць ім параўнальную ацэнку. Актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 7<br>(сем)<br><br>залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач. Свабоднае валоданне тыповымі рашэннямі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай. Уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і даваць ім аналітычную ацэнку. Самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |

| | |
|---|---|
| 8<br>(восем)<br><br>залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач. Здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне. Засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай. Уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання мовы і літаратурнага чытання і даваць ім аналітычную ацэнку. Актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 9<br>(дзевяць)<br><br>залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы. Дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільны выклад адказу на пытанні. Валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач. Здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы. Поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай. Уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і даваць ім аналітычную ацэнку. Сістэматычная, актыўнаясамастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 10<br>(дзесяць)<br><br>залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы. Дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), лагічна правільны выклад адказу на пытанні. Бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач. Выразная здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі. Поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках методыкі выкладання беларускай мовыі літаратурнага чытання і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін. Творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ **«МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ»** З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЛЬНАСЦІ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Методика преподавания русского языка и литературного чтения» | Беларускага і рускага мовазнаўства | Змест праграм узгоднены на стадыі распрацоўкі | Пратакол № 9 ад 26.03.2021 |